ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 13 (933) | АЎТОРАК, 7 кастрычніка 1997 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## З ганаровым званнем!

*За вялікі асабісты ўклад ва ўдасканаленне вучэбна-выхаваўчага працэсу, укараненне новых форм навучання і шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі першаму прарэктару нашага універсітэта прафесару **Міхаілу Васільевічу СЕЛЬКІНУ** прысвоена ганаровае званне **"Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь".***

*З гэтай нагоды яго горача віншуе калектыў універсітэта.*

## НА РЭКТАРАЦЕ

У апошні панядзелак верасня адбылося чарговае пасяджэнне рэктарата. Першым на парадку дня было абмеркавана пытанне аб стане вучэбных карпусоў і праведзенай рабоце па падрыхтоўцы іх да навучальнага года. Аб некаторым станоўчым вопыце ў гэтай справе расказаў дэкан біялагічнага факультэта С.Ф.Алешка. Ён зазначыў, што для стварэння нармальных умоў для навучання студэнтаў многае зроблена імі самімі, а таксама выкладчыкамі і супрацоўнікамі.

Па гэтаму пытанню затым выступілі дэканы матэматычнага, эканамічнага і фізічнага факультэтаў У.В.Арлоў, Т.В.Карпей, С.В.Шалупаеў. На рэктарацe зроблены вывад аб тым, што хаця мінуў ужо месяц новага навучальнага года, аднак работы па належнай падрыхтоўцы карпусоў неапраўдана зацягваюцца.

Заслуханы інфармацыі дэкана факультэта фізічнай культуры Б.М.Зайцава аб правядзенні навукова-практычнай канферэнцыі, начальніка планава-фінансавага аддзела С.Я.Пашук -- аб праекце палажэння прэміравання і выкарыстанні сродкаў на правядзенне практык.

Начальнік вучэбнага аддзела Н.І.Папкова паведаміла аб ходзе ліквідацыі акадэмічнай запазычанасці за другі семестр мінулага навучальнага года і аб запаўненні вакансій прафесарска-выкладчыцкага саставу.

Прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў засяродзіў увагу членаў рэктарата на асноўных палажэннях праекта Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Аб неадкладных мерах па ўмацаванню працоўнай і выканаўчай дысцыпліны", у абмеркаванні якога павінны прыняць актыўны ўдзел і члены універсітэцкага калектыву, выказаць па ім свае прапановы і зрабіць асабістыя заўвагі.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

***За шматгадовую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння кандыдат эканамічных навук дацэнт кафедры эканамічных тэорый ГЕРАСІМЧЫК Мікалай Вікенцьевіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.***

## Абмяркоўваем праект прэзідэнцкага Дэкрэта

### НЕ ДАПУСЦІЦЬ ПАСПЕШНАСЦІ

Лічу, што прымяненне ў поўнай меры тых санкцый, якія прадугледжаны за парушэнне працоўнай і выканаўчай дысцыпліны пры нашым для пераважнай большасці насельніцтва гаротным жыцці, вельмі жорсткае.

Канешне, вынесены на абмеркаванне праект прэзідэнцкага дакумента своечасовы і вельмі важны. Але ён патрабуе глыбока асэнсаванi я і канкрэтнай дапрацоўкі. Інакш, як кажуць, можна наламаць дроў.

Што датычыцца вышэйшай школы, то для рэалізацыі названага Дэкрэта неабходна стварыць належныя ўмовы для плённай працы выкладчыкаў і паспяховай вучобы студэнтаў.

**Ю.ПРАЛЯСКОЎСКІ, загадчык кафедры хіміі, дацэнт.**

### КАБ НА ПРАЦУ НЕ СПАЗНЯЦЦА...

Знаёмства з праектам Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у якім ставіцца мэта ўзмацніць дысцыпліну, парадак у працоўных калектывах, удасканаліць работу з кіруючымі кадрамі, навяло на наступныя думкі. Так, бясспрэчна, парадак патрэбен усюды, бо працоўная дысцыпліна ў многіх калектывах, мякка кажучы, жадае быць лепшай. Але варта паглядзець на гэту праблему і з іншага боку. Возьмем, напрыклад, такое парушэнне правілаў унутранага распарадку, як спазненне работнікаў на працу, за што ў праекце мяркуецца накладванне грашовых штрафаў. На жаль, ёсць акалічнасці, якія ставяць чалавека ў прамую залежнасць ад розных абставін. Напрыклад, калі работнік дабіраецца на працу з далёкага мікраараёна грамадскім транспартам, які чамусьці працуе не заўсёды рытмічна, могуць здарацца збоі ў часе.

Калі гаварыць канкрэтна аб нашай навучальнай установе, дзе рабочы дзень для яе супрацоўнікаў пачынаецца ў 8 гадзін, то, на думку пераважнай большасці жанчын, у асенне-зімовы перыяд яго можна было б пачынаць з 8.30, як гэта было раней. Гэтыя 30 хвілін такога дарагога ранішняга часу былі б для іх зусім не лішнімі, каб паспець адправіць дзяцей у школы і г.д. Не было б тады ў работніц ГДУ праблем са своечасовым прыходам на працу.

## КАРЫСНАЯ СУСТРЭЧА

Студэнты філалагічнага і біялагічнага факультэтаў нашага універсітэта сустрэліся з намеснікам начальніка асобнага аддзела аховы грамадскага парадку Цэнтральнага раёна А.М.Сапуновым, які ў сваёй гутарцы расказаў пра стан злачыннасці і правапарушэнняў на тэрыторыі названага раёна г. Гомеля. У сваім выступленні ён закрануў таксама пытанні, звязаныя з наркаманіяй, паводзінамі ў грамадскіх месцах. А.М.Сапуноў адказаў на зададзеныя пытанні, якія датычыліся бяспекі чалавека ў незвычайных абставінах.

**Л.КУЗЬМІЧ**, **намеснік дэкана філалагічнага факультэта па выхаваўчай рабоце.**

## АЗДАРАЎЛЯЦЬ ПРАЗ ФІЗІЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

У пачатку кастрычніка ў нашым універсітэце адбылася II Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Праблемы фізічнага выхавання насельніцтва, якое жыве ва ўмовах неспрыяльных фактараў акалягічага асяроддзя". Па гэтай тэматыцы быў заслуханы шэраг каштоўных дакладаў навукоўцаў і практыкаў на пленарным пасяджэнні і секцыях. Па найбольш актуальных і хвалюючых пытаннях кафедра аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры правяла "круглы стол".

Шырэй пра гэтую канферэнцыю вы даведаецеся з публікацыі ў наступным нумары нашай газеты.

*19-21 верасня адбыліся масавыя ўрачыстасці з нагоды 855-годдзя першага летапіснага ўпамінання г.Гомеля і 200-годдзя палаца-паркавага ансамбля з удзелам шматлікіх гасцей. Аб гэтай знамянальнай падзеі мы расказваем сваім чытачам.*

# ЛЮБЛЮ ЦЯБЕ, МОЙ ГОРАД, СТАРЫ І МАЛАДЫ...



**Помнік заснавальніку палаца-паркавага ансамбля М.П.Румянцаву, які быў адкрыты сёлета ў гонар юбілейнай даты.**

Такія словы прызнання выказвалі мы гораду над Сожам у дні яго юбілейных урачыстасцей. 19-21 верасня святкавалася 855-годдзе з першага летапіснага ўпамінання Гомеля , 200-годдзе яго слаўнага палаца-паркавага ансамбля.

Усе мы жылі прадчуваннем свята, назіралі, як горад прыгажэе літаральна не па днях, а па гадзінах, і чакалі... Чакалі цікавых мерапрыемстваў, сустрэч з цудоўным мастацтвам, якое абяцаў падараваць нам прымеркаваны да свята нашага горада І Міжнародны фестываль харэаграфіі "Сожскі карагод".

І спадзяванні нашы апраўдаліся. Старажытны і святочны горад над Сожам, наш абноўлены парк у гармоніі з цудоўнай творчасцю выканаўцаў танцавальнага жанру радавалі гамяльчан і шматлікіх гасцей на працягу трох дзён.

На цэнтральных вуліцах і плошчах горада, у скверы па вул.Савецкай, а таксама ў мікрараёнах на сцэнічных пляцоўках і ў Палацах культуры гамяльчане маглі азнаёміцца з творчасцю ўдзельнікаў фестывалю -- дзяржаўных, прафесійных калектываў і самадзейных, мясцовых. Былі ўдзельнікамі "Сожскага карагода" таксама дзіцячыя танцавальныя калектывы рэспублікі і вобласці.

У тых, каму пашчасціла трапіць па запрашальных білетах на ўрачыстае адкрыццё свята на цэнтральным стадыёне ВА "Гомсельмаш", на конкурс міжнароднага чэмпіянату выканаўцаў бальнага танца ў грамадска-культурным цэнтры, на свята народна-сцэнічнай харэаграфіі ў памяшканні дзяржцырка, убачыць на сцэне аблдрамтэатра спектакль А.Адана "Жызель" у выкананні артыстаў Нацыянальнага Акадэмічнага тэатра балета Рэспублікі Беларусь (мастацкі кіраўнік і галоўны балетмайстар -- народны артыст СССР і БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі В.Елізар'еў), а таксама балет М.Равэля "Балеро", які прывёз у Гомель Малы Акадэмічны тэатр оперы і балета імя Мусарскага (г.Санкт-Пецярбург), засталіся вельмі глыбокія, кранальныя ўражанні.



Харэаграфічныя кампазіцыі, розныя цікавыя спартыўныя спаборніцтвы, выступленні духавых аркестраў, фальклорна-харэаграфічных калектываў, работы народных умельцаў, а таксама найпрыгажэйшы святочны феерверк над Сожам змаглі ўбачыць тысячы гараджан у дні свята.



Шмат гасцей і ўдзельнікаў фестывалю прымаў наш горад-юбіляр -- звыш 50 розных творчых калектываў з многіх краін бліжняга і далёкага замежжа. Адзін толькі І Міжнародны чэмпіянат выканаўцаў бальнага танца сабраў каля 20 суддзяў з Германіі, Польшчы, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Расіі, Украіны, Беларусі. І сярод 150 спаборнічаючых танцавальных пар (а гэта фіналісты і паўфіналісты чэмпіянату свету і Еўропы, чэмпіёны краін), другое месца занялі гамяльчане -- пара міжнароднага класа Ірына Мельянцава і Аляксей Лабанаў, якія, дарэчы, з'яўляюцца выпускнікамі факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта.







Шматлікія ўзнагароды, дыпломы, памятныя прызы дасталіся лепшым танцавальным калектывам -- удзельнікам фестывалю. Уладальнікам "Гран-пры" стаў калектыў народна-сцэнічнага танца "Белая Русь" г.Мінска. Яго ўзровень выканання, майстэрства настолькі высокія, што ў журы не было доўгіх ваганняў, каму прысудзіць абсалютную перамогу.

...За святамі зноў надыходзяць будні. Але мы яшчэ доўга будзем жыць светлымі ўспамінамі аб свяце, што падарыла ўсім радасць і добры настрой. А бусел, які быў сімвалам І Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва, яшчэ вернецца ў наш горад, бо гэты фестываль стане традыцыйным.

Т.НІКАЛАЕВА.



Фота У.ЧЫСЦІКА.

# МІЖНАРОДНЫЯ СКАРЫНАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

У Полацкім музеі беларускага кнігадрукавання на высокім узроўні прайшлі скарынаўскія чытанні. Яны былі арганізаваны Дзяржаўным камітэтам па друку Рэспублікі Беларусь, міністэрствамі адукацыі і культуры, Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтрам імя Ф.Скарыны, полацкімі дзяржаўным універсітэтам, гісторыка-культурным музеем-запаведнікам і музеем гісторыі беларускага кнігадрукавання. Фінансавую падтрымку аказала Віцебскае абласное аддзяленне фірмы "Белвест". Прысвячаліся чытанні 480-годдзю беларускага кнігадрукавання, якое адзначалася 6 жніўня бягучага года.

У праграму чытанняў было ўключана 47 навуковых дакладаў і паведамленняў. У чытаннях удзельнічалі і незаяўленыя скарыназнаўцы -- Мікалай Нікалаеў з Дзяржаўнага Эрмітажа ў Санкт-Пецярбургу, Навум Гальпяровіч -- вядомы беларускі паэт.

Гэта былі самыя значныя і аўтарытэтныя чытанні, як можна меркаваць па ўдзельніках. З глыбокімі навуковымі дакладамі выступалі такія знакамітыя скарыназнаўцы, як Юрый Лабынцаў -- доктар філалагічных навук, загадчык Цэнтра беларусазнаўчых даследаванняў Інстытута славяназнаўства і балканістыкі Расійскай Акадэміі навук; Вітаўт Кіпель -- доктар геалогіі, дырэктар Беларускага інстытута навукі і мастацтва Нью-Йорка, ганаровы доктар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы, сапраўдны член Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі; Аляксандр Баршчэўскі -- доктар філалогіі, загадчык кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага дзяржаўнага універсітэта; Уладзімір Конан -- доктар філасофскіх навук, загадчык аддзела Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф.Скарыны; Барыс Сапуноў -- доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік Пятроўскай Акадэміі навук і мастацтваў, галоўны навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага Эрмітажа; Юозас Гянзяліс -- доктар філалогіі, прафесар Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта; Віктар Шматаў -- доктар мастацтвазнаўства, загадчык аддзела Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі за даследаванні ў галіне скарыназнаўства; Аляксей Каўка -- доктар філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута сусветнай літаратуры Расійскай Акадэміі навук; Адам Мальдзіс -- доктар філалагічных навук, прафесар, дырэктар Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф.Скарыны і Уладзімір

(ЗАКАНЧЭННЕ НА 4-стар.)

# МІЖНАРОДНЫЯ СКАРЫНАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК на 3-стар.)

Анічэнка -- доктар філалагічных навук, прафесар нашага універсітэта, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі за даследаванні ў галіне мовазнаўчага скарыназнаўства.

Заслуханыя даклады з'яўляюцца паглыбленнем усіх аспектаў скарыназнаўства, у той ці іншай ступені абгрунтоўваюць новыя напрамкі ў даследаваннях творчай спадчыны Ф.Скарыны. На пленарным пасяджэнні абмеркаваны даклады "Дзейнасць Францыска Скарыны ў сталіцы Чэхіі" Францішкі Сокалавай, "Жыццяпіс Францыска Скарыны ў дакументах і матэрыялах" Георгія Галенчанкі, "Скарына і славянства" Юрыя Лабынцава, "Ф.Скарына і Альбрэхт Дзюрэр: да пытання пра рэнесансныя традыцыі ў беларускім мастацтве" Віктара Шматава і іншыя.

На секцыі "Новыя штрыхі да характарыстыкі жыцця і дзейнасці Ф.Скарыны" абмеркаваны даклады "Скарына як духоўны пісьменнік" Алены Яскевіч -- кандыдата філалагічных навук, старшага навуковага супрацоўніка Інстытута літаратуры імя Я.Купалы НАН Беларусі, "Праблема перакладу твораў Ф.Скарыны на сучасную беларускую мову" Мікалая Воінава і аўтара дадзеных радкоў, "Захаванне скарынаўскай спадчыны ў Беларусі" Таццяны Рошчынай, загадчыцы аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

Былі абмеркаваны таксама даклады па напрамках: "Традыцыі асветніцтва і кнігадрукавання на полацкай зямлі і ў Беларусі", "Сучасны стан кнігавыдавецкай справы і скарыназнаўства".

Трэція міжнародныя скарынаўскія чытанні з'явіліся новым укладам у скарыназнаўчую навуку, важным імпульсам у працяг і пашырэнне дадзенага напрамку навуковых даследаванняў у сусветным маштабе. Добра, што вучоныя, выкладчыкі і супрацоўнікі нашага універсітэта, які носіць імя таго, хто з'яўляецца аб'ектам навуковага даследавання, прадметам скарыназнаўчай навукі, прыкладаюць актыўныя намаганні па ўвекавечанню і ўвасабленню ў нашу сучасную культуру творчых дасягненняў буйнога ўсходнеславянскага асветніка, вучонага і першадрукара.

**К.УСОВІЧ,**
**загадчык музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**

# ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ВУЧОНЫХ

У Мінску адбылася Міжнародная канферэнцыя нацыянальных камітэтаў краін Еўропы і Паўночнай Амерыкі па праграме ЮНЕСКА МАБ -- "Чалавек і біясфера" (ЕўраМАБ -- VI). У яе рабоце прынялі ўдзел прадстаўнікі 28 краін.

Канферэнцыю адкрыў акадэмік АН Беларусі Л.Сушчэня. Яе ўдзельнікаў вітаў віцэ-прэм'ер Рэспублікі Беларусь У.Русакевіч, які зачытаў прывітальны зварот Прэзідэнта нашай краіны А.Р.Лукашэнкі. З цёплымі словамі да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуўся прэзідэнт АН Беларусі акадэмік А.Вайтовіч.

Вялікая ўвага на канферэнцыі ўдзялялася ролі ЕўраМАБ у выпрацоўцы механізму захавання біяразнастайнасці, інтэгрыраванаму доўгатэрміноваму маніторынгу навакольнага асяроддзя на рэгіянальным, дзяржаўным, міждзяржаўным і планетарным узроўнях з выкарыстаннем міжнароднай сістэмы "ІНТЭРНЭТ".

Па ўсіх абмяркоўваемых праблемах на канферэнцыі былі ажыўленыя дыскусіі, слушныя заўвагі і прапановы.

Цікавая інфармацыя на канферэнцыі была прадстаўлена ў выглядзе стэндавых дакладаў па праблемах рацыянальнага выкарыстання і аховы прыродных рэсурсаў. Ад нашага універсітэта быў прадстаўлены стэндавы даклад аўтара гэтых радкоў, М.М.Дайнэкі і С.У.Аўсеенкі "Сінтаксамонія,фітаразнастайнасць і ахова лугавой расліннасці (на прыкладзе пойм Беларускага Палесся)". Аналіз стэндавых дакладаў зрабілі прафесар В.Неронаў (Расія) і доктар М.Морыс з Вялікабрытаніі, якія далі станоўчую ацэнку ўсім дакладам, у тым ліку і нашаму.

Вынікі работы канферэнцыі і перспектывы развіцця далейшых даследаванняў па праграме МАБ былі прааналізаваны прафесарам Л.Крузэ-Граўманам з Германіі. Асаблівая ўвага была звернута на інтэгрыраваны доўгатэрміновы маніторынг з выкарыстаннем міжнароднай сістэмы "ІНТЭРНЭТ".

Закрыццё канферэнцыі абвясціў прафесар В.Салдатаў -- старшыня беларускага нацыянальнага камітэта МАБ -- "Чалавек і біясфера".

Для ўдзельнікаў канферэнцыі была арганізавана экскурсія ў Бярэзінскі біясферны запаведнік.

Трэба спадзявацца, што прайшоўшая міжнародная канферэнцыя па праграме ЮНЕСКА МАБ -- "Чалавек і біясфера" будзе садзейнічаць далейшаму пашырэнню і паглыбленню даследаванняў па рацыянальнаму прыродакарыстанню, захаванню біяразнастайнасці, ахове жывой абалонкі Зямлі.

**Л.САПЕГІН,**
**прафесар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін.**

# КОНКУРС МАЛАДЫХ

*Беларускі фонд фундаментальных даследаванняў аб'яўляе конкурс для маладых вучоных "Навука-97 М" на саісканне грантаў гэтага фонду.*

*Саіскальнікамі грантаў для маладых вучоных могуць быць навуковыя работнікі, спецыялісты, аспіранты, студэнты вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь ва ўзросце да 33 гадоў.*

***Заявы на конкурс прымаюцца да 14 лістапада 1997 года.***

*Звесткі аб парадку прадстаўлення заявак на гранты можна атрымаць у НДС*
*(п.5-6, корпус №4, тэл. 57-33-12; п.5-14, корпус №5, тэл. 56-73-38).*

# НА ІНСТРУКТЫЎНАЙ НАРАДЗЕ

Пасля таго як Рэспубліка Беларусь стала незалежнай суверэннай дзяржавай, яна ператварылася ў своеасаблівы калідор зносін усходніх і заходніх краін. У апошнія ўсё часцей спрабуюць пранікнуць нелегалы, асабліва прадстаўнікі азіяцкіх народаў. Гэта небясшкодна і не можа не насцярожваць. Вось чаму, улічваючы тое, што ў нашым універсітэце вучацца замежныя студэнты, аддзел замежных сувязей правёў з імі інструктыўную нараду. На ёй растлумачаны парадак уезду ў нашу краіну і выезду з яе і меры, якія будуць прымацца да парушальнікаў перасячэння дзяржаўнай граніцы.



# *Выстаўкі* "ГРАМАДЗЯНІН ГЕРМАНІІ І ЕЎРОПЫ"

Пад такой назвай у выставачнай зале нашага універсітэта разгорнута экспазіцыя, прысвечаная заснавальніку Федэратыўнай Рэспублікі Германіі Конраду Адэнауэру. У фотаздымках, шматлікіх дакументах адлюстраваны жыццё і дзейнасць буйнога дзяржаўнага дзеяча, які ўнёс рашаючы ўклад у замацаванне дэмакратыі ў ФРГ. Тыя палітычныя рашэнні, якія прымаў канцлер К.Адэнауэр, маюць важнейшае значэнне для Германіі, якая аб'ядналася на аснове свабоднага самавызначэння. Ён ажыццявіў пераарыентацыю ў знешняй палітыцы, якая была смелай і перспектыўнай. К.Адэнауэру бачылася свабодная і



аб'яднаная Германія ў свабоднай і аб'яднанай Еўропе. Ён пастаянна шукаў шляхі для ўрэгулявання адносін з Савецкім Саюзам, што мела важнае палітычнае значэнне для ўсяго свету. Яго мэтай было ўстанаўленне новага мірнага і свабоднага ладу ў Еўропе, глабальная разрадка і супрацоўніцтва. Смелая палітыка К.Адэнауэра стварыла аснову для новай міратворчай ролі Германіі ў супольніцтве народаў.

Дадзеная выстаўка была паказана спачатку ў г. Санкт-Пецярбургу, затым была прывезена ў нашу рэспубліку --у Мінск, Віцебск, Магілёў, у наш горад. Яна дэманстравалася ў рамках праводзімай міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай гэтаму палітычнаму дзеячу.

На ўрачыстым адкрыцці выстаўкі, на якую прыйшлі кіраўнікі абласнога цэнтра, грамадскасць горада, выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты ГДУ, было зачытана прывітанне яе ўдзельнікам ад дырэктара Фонду К.Адэнауэра Паўля Вінка, выступілі прадстаўнік гэтага фонду ў Санкт-Пецярбургу Рудольф Тоу, а таксама першы прарэктар ГДУ прафесар М.В.Селькін, загадчыца гарадскога аддзела культуры г.Гомеля Л.К.Сайкова і інш.

(Наш кар.)

**На здымку: урачысты момант адкрыцця выстаўкі.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

# ДАСЛЕДУЕЦЦА ДУХОЎНАЯ І КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА

Наш універсітэт правёў навуковую канферэнцыю "Духоўная і культурная спадчына Беларускага Палесся". Да яе ўдзельнікаў з цёплымі прывітальнымі словамі звярнуўся прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце ГДУ кандыдат філалагічных навук дацэнт М.М.Воінаў і пажадаў навукоўцам плённай працы.

На пленарным пасяджэнні першае слова было прадстаўлена кандыдату філалагічных навук загадчыку фальклорнай лабараторыі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта В.Д.Ліцвінку. Яго даклад "Адметнасць песеннага рэпертуару пагарынскага Палесся", які аўтар насыціў тэматычнымі песнямі у асабістым выкананні, быў выслуханы з вялікай цікавасцю.

Даклад доктара філалагічных навук прафесара кафедры беларускай мовы ГДУ У.В.Анічэнкі асвятляў пытанні палескіх беларуска-украінскіх моўных паралеляў.

Загадчыца кафедры беларускай мовы Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта прафесар Г.М.Малажай расказала аб укладзе выкладчыкаў і супрацоўнікаў сваёй вышэйшай навучальнай установы ў вывучэнне духоўнай і культурнай спадчыны Беларускага Палесся.

Загадчыца кафедры беларускай літаратуры Мазырскага дзяржпедінстытута дацэнт Л.І.Прашковіч выступіла з дакладам "Духоўнае аблічча палешука ў нарысах В.Палтаран".

Пасля пленарнага пасяджэння канферэнцыя працягвала сваю работу ў секцыях мовазнаўства і літаратуразнаўства. На іх заслуханы і абмеркаваны даклады і паведамленні, якія маюць значную навуковую каштоўнасць у асэнсаванні гісторыі роднага краю ў самых шырокіх яе аспектах.

Пры падвядзенні вынікаў канферэнцыі прынята рашэнне праводзіць яе па азначанай вышэй тэматыцы і ў наступныя гады ў розных ВНУ Палескага рэгіёна.

**Б.ВАЛОДЗІН.**





**На здымку: на пленарным пасяджэнні канферэнцыі з дакладам выступае В.Д.Ліцвінка.**
**Фота У.Чысціка.**

# ПРЭСТЫЖ НУЛЯВОГА КУРСА

Учора пачаліся заняткі на стацыянары падрыхтоўчага аддзялення нашага універсітэта. Неабходна адзначыць, што сёлета конкурс на яго быў сымым высокім за ўсе гады існавання ГДУ. На 75 планавых месц было пададзена 249 заяў. Гэта 3,3 чалавека на адну вакансію, або амаль у два разы больш, чым быў конкурс на першы курс дзённага навучання.

Самым высокім аказаўся конкурс на спецыяльнасць "правазнаўства". На 6 планавых месц прэтэндавала 37 челавек. Больш чым па 5 чалавек змагаліся за кожнае месца на спецыяльнасці "беларуская мова і літаратура" і "фізічная культура", па 5 -- на спецыяльнасць "біялогія".

Нельга не звярнуць увагу і на тое, што сёлета на падрыхтоўчае аддзяленне паступалі юнакі і дзяўчаты з высокім узроўнем падрыхтоўкі. Сярод іх быў 31 медаліст сярэдніх школ і 2 уладальнікі чырвоных дыпломаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Добры кантынгент паступаючых дазволіў набраць самых дастойных на стацыянар і даўкамплектаваць падрыхтоўчае аддзяленне для завочнага навучання. Пэўная частка моладзі прынята на вучобу на платнай аснове.

К 855-летию первого упоминания Гомеля в летописи

**Краеведы разных поколений уже пытались пред-
ставить "собирательный образ" старой гомельской
истории. Начало поиску положил "патриарх" нашего
краеведения Лев Алексеевич Виноградов. Именно
он, автор книги "Гомель". Его прошлое и настоящее.
1142-1900", изданной еще на рубеже веков, заложил
первый камень в фундамент величественного здания
нашей Истории. И как бы ни судили этот труд по про-
шествии десятилетий, никто не сможет отказать Ви-
ноградову в почетном звании Первопроходца, при-
поднявшего пелену забвения над далеким прошлым
малозаметного тогда уездного городка.**

**Новая книга, посвященная истории Гомеля, под-
готовлена к изданию кандидатом исторических наук
О.А.Макушниковым с кафедры всеобщей истории
нашего университета. С сегодняшнего номера мы на-
чинаем печатать ее в сокращении.**

1

## СТАРЫЙ ГОМЕЛЬ

В разные годы к древнейшему прошлому Гомеля обращались известные и малознакомые читателю исследователи: дореволюционные ученые И.И.Григорович и Е.Р.Романов, краеведы И.А.Сербов, И.Ф.Жудро, Д.И.Довгялло, наши современники -- Г.С.Евдокименко, Г.В.Штыхов, П.Ф.Лысенко, М.А.Ткачев, М.Ф.Спиридонов, В.А.Литвинов, А.Ф.Рогалев и др.

Долгие годы наша история писалась на основании документов письменных. Но у таковой был свой "нижний" предел -- 1142 год, время появления Гоме-

2

ля на страницах летописи. Археологические раскоп-
ки, систематически проводимые гомельскими учены-
ми с 1986 года, позволили прочитать страницы уди-
вительной "земляной летописи" города, существенно
дополняющей и удлиняющей летопись "обычную". Ар-
хеологическим памятникам города посвящена науч-
но-популярная книга автора этих строк "В поисках
древнего Гомия" (1994 год).

Задача этой публикации -- не просто ознакомить
читателя с авторским видением старейшей истории
Гомеля, но и с подлинными документальными свиде-
тельствами. Повествование построено на основе ис-
торических источников, публиковавшихся ранее и поч-
ти неизвестных. Вновь обнаруженные археологичес-
кие материалы позволяют обрисовать наиболее зага-
дочный, "туманный" пласт гомельского прошлого.
Уникальные находки, извлеченные из "доисторичес-
ких" наслоений, рассказывают о расселении на бере-
гах Сожа первобытных людей, о древнейших поселе-
ниях на территории современного города и его заро-
ждении, об эпохе радимичей. Именно археология ре-
шительно "отодвигает" дату возникновения города в
глубь веков, опровергая наивный тезис: "1142 год --
время основания Гомеля".

Данные раскопок помогают воссоздать важные моменты истории города в эпоху Киевской Руси и Черниговского княжества. За "немыми" остатками жилых строений, крепостных рвов, черепками, орудиями труда, предметами вооружения встает картина богатого восточнославянского Гомия, столь незаслуженно обойденного вниманием летописцев.

3

**Доистория. Во мгле тысячелетий.**

Куда ни брось взгляд -- бескрайняя тундра или, скорее, тундростепь с серыми пятнами скудной растительности, унылые болота и голые холмы. Большая река медленно несет вдаль темные холодные воды. По склонам глубоких оврагов и береговым обрывам, защищенным от ледяного дыхания ветра, ютятся небольшие островки хвойного и березового леса. Низко над землей плывут свинцовые тучи, обещающие непогоду...

Наверное, такой могли увидеть незнакомую безлюдную местность, тысячелетия спустя названную Гомием, отряды первобытных охотников, которые продвигались с юга вслед за стадами неприхотливого обитателя сурового приледникового края -- мамонта. Это случилось примерно 27-25 тысяч лет тому назад, в эпоху палеолита (древнекаменного века).

Коллективная охота на мамонта была главным содержанием жизни первобытного человека. Периодически ему удавалось добывать шерстистого носорога, бурого медведя, лошадь, песца. Охота на крупных животных требовала немалых усилий. Громким шумом, подожженной травой и факелами охотники гнали мамонтов в болотные трясины, овраги, специально устроенные ловушки-ямы, где кололи копьями и добивали камнями. Мамонт весил несколько тонн, достигал трехметровой высоты, поэтому такой трофей надолго обеспечивал весь род мясом.

Древнейшие поселения на берегах Сожа не были долговременными. Люди обитали лишь там, где имелось необходимое количество животных и прочей

4

пищи. Малой группе охотников требовалась огромная промысловая территория вокруг стоянки. После истощения угодий люди снимались с обжитого места и уходили в поисках нового за многие десятки и сотни километров.

Первопоселенцы не оставили на нашей земле потомков, которые могли бы положить начало поколениям далеких предшественников гомельчан. Природа была беспощадна к людям и надолго изгнала их из вновь обретенного края арктической стужей и неумолимым наступлением ледника. Обширное распространение северных льдов имело место 17-18 тысяч лет назад, когда Посожье стало непригодным для обитания. Люди ушли на юг.

Новое потепление наметилось около 14 тысяч лет назад. Ледник окончательно отступил на север, а на место тундры вернулись открытые пространства с разбросанными по ним березово-сосновыми лесами.

Быт людей, появившихся на берегах Сожа около 12-11 тысяч лет назад, во многом отличался от жизни их далеких предшественников. Основные изменения коснулись охоты, ибо навсегда исчез мамонт, кормивший и обогревавший первобытного человека. Его место занял северный олень -- животное осторожное, пугливое, передвигавшееся с большой быстротой. Поблизости от них и строились охотничьи поселки.

Повадки и образ жизни оленя заставили людей искать новые, более эффективные способы охоты.

(ПРАЦЯГ У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ)



*Слова да чытача*

# КНІГАМІ КАРЫСТАЙЦЕСЯ АШЧАДНА

З пачаткам навучальнага года ажывілася работа ў чытальных залах бібліятэкі, на абанементах вядзецца выдача камплектаў падручнікаў першакурснікам. У бібліятэкі няма свайго асобнага памяшкання, таму пункты выдачы літаратуры сканцэнтраваны па вучэбных карпусах.

**Абанемент N1 (корп. N2, п.1-20)** укамплектаваны літаратурай па тэхнічных навуках, матэматыцы, біялогіі, медыцыне, сельскай гаспадарцы, фізічнай культуры, педагогіцы, філасофіі, псіхалогіі, рэлігіі. Тут жа знаходзіцца алфавітны каталог для чытачоў. **На абанеменце N2 (Савецкая, 106)** сабрана літаратура па гісторыі, правазнаўству, філалогіі, мастацтву, мастацкай літаратуры, ёсць картатэка загалоўкаў мастацкіх твораў. У фондзе маюцца энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі. **Абанемент N3 (корп. N4, п.1-3)** змяшчае літаратуру па эканамічных навуках. **Абанемент N4 (корп. N5, п.2-8)** укамплектаваны літаратурай па фізічных навуках. **Абанемент N5 (корп.N5, п.3-5)** выдае літаратуру па замежных мовах. **У чытальнай зале N1 (корп. N4, п.2-2)** ёсць літаратура па эканамічных, філалагічных, гістарычных навуках, паліталогіі. Тут на адкрытым доступе стаяць рэфератыўныя часопісы і падшыўкі газет. Вядзецца картатэка перыядычных выданняў і каталог доктарскіх дысертацый. Чытальная зала N1 вядзе падпіску на перыёдыку, выпісваемую універсітэтам. **Чытальная зала N2 (корп. N2, п.3-9)** укамплектавана літаратурай па матэматыцы, біялогіі, геалогіі, гісторыі, праву, **а чытальная зала N3 (корп.N5, п.2-7)** -- перыёдыкай і літаратурай па фізіцы. Чытальныя залы працуюць з 9 да 18 г., абанементы з 10 да 18 г.

**У даведачна-бібліяграфічным аддзеле (корп. N4, п.3-4)** знаходзіцца сістэматычны каталог на ўвесь фонд бібліятэкі, сістэматычная картатэка часопісных і газетных артыкулаў, краязнаўчая картатэка перыядычных выданняў, картатэка работ выкладчыкаў ГДУ. Фонд аддзела ўкамплектаваны энцыклапедыямі, даведнікамі, слоўнікамі, бібліяграфічнымі паказальнікамі. У СБА апрацоўваюцца (распісваюцца) усе перыядычныя выданні, якія паступаюць у бібліятэку. Сюды прыходзяць чытачы, калі трэба падабраць літаратуру па тэме для рэферата, дыпломнай работы. **У аддзеле апрацоўкі (корп. N4, п.1-14)** кнігі апрацоўваюцца, класіфікуюцца і размяркоўваюцца па абанементах і чытальных залах. Аддзел вядзе генеральны алфавітны каталог на ўвесь фонд бібліятэкі. **Аддзел камплектавання (корп. N4, п.1-7а)** займаецца камплектаваннем фонду бібліятэкі. Сюды звяртаюцца чытачы ў выпадку страты кнігі.

Дырэктар бібліятэкі знаходзіцца ў галоўным корпусе, у п.3-5. Усе абанементы і чытальныя залы вядуць алфавітныя і сістэматычныя каталогі на свае фонды. Ва ўсіх аддзелах бібліятэкі маюцца правілы карыстання бібліятэкай.

Аб тэрмінах захавання перыядычных выданняў трэба сказаць асобна. Газеты захоўваюцца 3 гады. Тоўстыя часопісы гуманітарнага профілю -- 10 гадоў, тонкія -- 5 гадоў. Мастацка-публіцыстычныя часопісы не спісваюцца.

Самае хвалюючае пытанне для бібліятэкі -- нізкая культура нашых чытачоў. Хочацца нагадаць ім выказванне акадэміка Д.С.Ліхачова, які сказаў: "Культура не выдаётся как приложение к диплому о высшем образовании, к социальному положению, к денежному карману". Нізкая культура нашых чытачоў выражаецца не толькі ў варварскіх адносінах да кніг, але і ў хамскай форме адносін з работнікамі бібліятэкі, у манеры паводзін чытачоў у чытальных залах, на калідорах, паміж сабой. У чытальных залах (асабліва эканамічнага факультэта) амаль не засталося цэлых часопісаў, кніг. Асабліва актуальнае зараз пытанне звароту кніг даўжнікамі пры вострым дэфіцыце грашовых сродкаў на набыццё літаратуры і на падпіску. Амаль уся літаратура, якая ўтрымліваецца, -- кнігі павышанага попыту. Усяго ва універсітэце 1154 даўжнікі, колькасць утрымліваемых імі кніг складае 5920 экземпляраў. Акрамя таго кожны год нашы чытачы губляюць каля 1,5 тысячы кніг. Лічбы жахлівыя, страты бібліятэцы, вучэбнаму працэсу вялізныя. Кожны вырваны артыкул з часопіса або кнігі, кожная страчаная або нявернутая кніга -- гэта адмова іншым студэнтам у інфармацыі. А многія студэнты -- (правазнаўцы) трымаюць кнігі ў сябе гадамі! І гэта пры такім небагатым фондзе па праву. Па даўжніках пальма першынства ў такіх факультэтаў, як эканамічны (на руках 145 чытачоў знаходзяцца 408 экземпляраў нездадзеных кніг); гісторыка-юрыдычны (187/650); фізічны (199/1176); фізічнай культуры (114/700); а таксама на спецыяльнасцях англійскай і нямецкай моў (109/328).

Кнігі зараз вельмі дарагія. Па правілах карыстання бібліятэкай за страчаную кнігу трэба вярнуць раўнацэнную, або кампенсаваць яе 10-разовы кошт. Таму адносьцеся да кніг беражліва, хаця б з меркантыльнага інтарэсу, калі ўзровень культуры не дазваляе іншага.

**Л.ПЯТРОВА,**
**галоўны бібліёграф бібліятэкі.**

☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺

☺ *УСМІХНІЦЕСЯ* ☺

-- Господин профессор, там перад вашей дверью нищий. Он просит хоть что-нибудь.

-- Хорошо, Марта, дайте ему две задачки по геометрии.

☺☺☺

--Не понимаю, как это люди в прежние времена могли жить без радио, телевидения, телефона!?

-- А никак. Ты же знаешь -- они все умерли.

☺☺☺

-- Мамочка, я насыплю рыбкам еще корма. Сегодня, в день моего рождения, я хочу, чтобы кругом были счастливые лица.

☺☺☺

-- Мне стыдно в этом признаться, но если меня спросят, каким образом получается электрический ток, я ничего не смогу сказать. Все, абсолютно все забыл, что когда-то учил в школе!

-- Какие пустяки! Вот смотри! Я подхожу к выключателю и, пожалуйста, лампочка зажглась.

☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺

*Спорт* • *Спорт* • *Спорт* • *Спорт* • *Спорт* • *Спорт*

**Поліятлон**

## НА ЯЕ РАЎНЯЦЦА МАЛАДЫМ

Такіх спартсменак, як выкладчыца кафедры фізічнага выхавання і спорту нашага універсітэта Галіна Галаўнёва, бясспрэчна, лічаныя адзінкі. У вялікім спорце яна ўжо больш за два дзесяцігоддзі, майстар спорту па трох відах. Найбольш высокія яе дасягненні ў поліятлоне.

Тут трэба аднолькава паспяхова выступаць у спрынце, кросе, плаванні, стральбе, кіданні гранаты. І гэта ўдаецца Г.Галаўнёвай на працягу многіх гадоў. У складаным шматбор'і яна з'яўляецца неаднаразовай чэмпіёнкай свету.

Званне мацнейшай на планеце выдатная спартсменка пацвердзіла і на чарговым чэмпіянаце свету па поліятлону, які быў праведзены ў верасні ў сталіцы нашай краіны -- Мінску. Яна зноў узнялася на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару і атрымала залатую ўзнагароду. Паспяхова выступіла і яе выхаванка студэнтка факультэта фізічнай культуры Наталля Соцкая. Яна заняла высокае чацвёртае месца.

Да апошняга віду спаборніцтваў у камандным заліку лідзіравалі спартсменкі Беларусі. Аднак на фінішы іх здолелі апярэдзіць расіянкі. Але і другое месца трэба расцэньваць як спартыўны подзвіг, найбольшы ўклад у які ўнеслі прадстаўніцы нашага універсітэта.

---

**Цяжкая атлетыка**

## ПОСПЕХ НАШАГА ВЕТЭРАНА

У польскім горадзе Кашалін, які размяшчаецца на ўзбярэжжы Балтыйскага мора, праведзены чэмпіянат свету па цяжкай атлетыцы сярод ветэранаў. За ўзнагароды змагаліся каля 400 штангістаў з 40 краін. Яны выступалі ў васьмі ўзроставых групах ад 35 да 85 гадоў.

Гонар Беларусі на гэтых прэстыжных спаборніцтвах абараняў дацэнт кафедры філасофіі нашага універсітэта майстар спорту А.А.Фяськоў. Ён выступаў у вагавай катэгорыі да 83 кг у пятай узроставай групе ад 60 да 65 гадоў. Яго сапернікамі былі 17 асілкаў. Па-за канкурэнцыяй аказаўся асілак з ЗША, які ў суме двухбор'я набраў 205 кг. За наступныя прызавыя месцы разгарнулася вострая барацьба паміж нашым спартсменам і ўкраінцам М.Хаменкам, які, дарэчы, быў чэмпіёнам СССР, на працягу некалькіх гадоў уваходзіў у склад яе зборнай каманды. Напружаны паядынак завяршыўся на карысць штангіста з суседняй краіны. Яго сума -- 187 кг. На 5 кг меншы вынік у нашага ветэрана. Але і бронзавая ўзнагарода сусветнага чэмпіянату -- гэта таксама вялікі поспех.

---

**Ручны мяч**

## КАМАНДА ПАТРАБУЕ ПАДМАЦАВАННЯ

Завяршыўся розыгрыш Кубка Беларусі па ручному мячу сярод жаночых каманд. На заключным яго этапе аспрэчваў ганаровы трафей квартэт фіналістак. Па-за канкурэнцыяй аказаліся шматразовыя чэмпіёнкі краіны гандбалісткі мінскага "Політэхніка", якія ў апошняй сустрэчы дабіліся пераканаўчай перамогі над нашымі дзяўчатамі -- камандай "Універсітэт" і да звання чэмпіёнак дабавілі пераходны прыз.

Гамяльчанкі ў канчатковым выніку аказаліся толькі чацвёртымі.

-- На большае, -- як сказаў трэнер каманды В.Крукоўскі, -- мы амаль і не разлічвалі, бо выступалі ў аслабленым саставе. Па розных прычынах з намі развіталіся некаторыя мацнейшыя ігракі. Розыгрыш Кубка для нас праходзіў, па сутнасці, як падрыхтоўка да чарговага чэмпіянату краіны.

Для таго, каб "Універсітэту" заставацца на перадавых пазіцыях айчыннага жаночага гандболу, паспяхова выступаць на еўрапейскай арэне, патрэбны адпаведныя затраты і даўкамплектаванне каманды ігракамі высокага класа. Але, як зазначыў В.Крукоўскі, належнай падтрымкі не адчуваецца. Напрыклад, сёлета калектыў магла папоўніць перспектыўная абаронца, рост якой 195 см. Аднак яна не здолела стаць слухачкай падрыхтоўчага аддзялення.

**(Наш кар.)**

---

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- беларускай літаратуры-- ст.выкладчыка;
-- беларускай культуры -- ст.выкладчыка;
-- алгебры і геаметрыі -- ст.выкладчыка (2);
-- фізвыхавання і спорту -- дацэнта, ст.выкладчыка (2);
-- псіхалогіі і падрыхтоўкі для паступлення ў ВНУ -- асістэнта;
-- эканамічных тэорый -- дацэнта;
-- рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства -- асістэнта;
-- рускай літаратуры -- асістэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

---

Рэктарат, грамадскія арганізацыі, увесь калектыў універсітэта выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю **СЕЛЬКІНАЙ Людміле Антонаўне** і першаму прарэктару прафесару **СЕЛЬКІНУ Міхаілу Васільевічу** з выпадку напаткаўшага іх гора -- смерці **БАЦЬКІ** і **ЦЕСЦЯ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў эканамічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці **БАБЫНУ Уладзіміру Піліпавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора -- заўчаснай смерці **БРАТА**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры псіхалогіі і падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту названай кафедры **ЕЛІСЕЕВАЙ Ірыне Міхайлаўне** ў сувязі з напаткаўшым яе горам -- смерцю **МАЦІ**.

Рэктарат, Савет ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл смуткуюць з выпадку смерці актыўнага ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны падпалкоўніка ў адстаўцы **ЖУКАВА Пятра Уладзіміравіча** і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.

---

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 372.
Падпісана да друку 03..10.97.